18+

ДЗМІТРЫЙ КУДРЭЦ

# Вясковыя гісторыі

ДВАЦЦАЦЬ ГОД АПАСЛЯ



Дзмітрый Кудрэц

# Вясковыя гісторыі. Дваццаць год апасля

«Издательские решения»

**Кудрэц Д.**

Вясковыя гісторыі. Двааццаць год апасля / Д. Кудрэц — «Издательские решения»,

ISBN 978-5-00-560482-8

Прайшло дваццаць год. Грымнулі, палыхнулі і зніклі дзесьці сярод шэрых хмар. Чаго толькі не перажылі сіняборцы за гэты час, чаго толькі не спазналі.Памяняліся звычкі, ўстоі. Змяніліся людзі. Ўсе кудысьці спяшаюцца, бягуць, ляцяць.І некалі за гэтай мітуснёй проста жыць. Жыць, не гледзячы ні на якія перамены і перабудовы. Жыць па сваіх, праверных часам і продкамі законах. Жыць самім і даваць жыцце іншым.

ISBN 978-5-00-560482-8

© Кудрэц Д.

© Издательские решения

# Содержание

Уступ 6
Эпапея з сабакам 8
Цюльпаны 11
Суперцэмент 14
Цешча 17
Спека 19
Чарнічная ліхаманка 21
Зяць у перспектыве 26
Конец ознакомительного фрагмента. 27

# Вясковыя гісторыі
# Дваццаць год апасля
# Дзмітрый Кудрэц

© Дзмітрый Кудрэц, 2022
ISBN 978-5-0056-0482-8
Создано в интеллектуальной издательской системе Ridero

# Уступ

Дваццаць год пранеслася, нібы бліскавіца ў небе. Грымнулі, палыхнулі і зніклі дзесьці сярод шэрых хмар.

Колькі ўсяго здарылася за гэтыя дваццаць год і не пералічыць. А калі сесці ды паразважаць, то і ўспомніць асабліва і нечага.

Шмат весак знікла за гэтыя дваццаць год, пакінуўшы за сабой толькі тапаграфічныя назвы ды закалочанныя хаты. Старыя гаспадары з'ехалі, альбо памерлі, а новых не знаходзілася. Пакупнікі не спяшаліся выкласці грошы за куток вясковасці ў чорта на рагах. Вось і стаяць пакінутыя бацькоўскія сядзібы ад лета да лета з агаленнымі вокнамі, някошанымі межамі і пакасіўшыміся платамі ў чаканні, калі на пару дзен з'явяцца нашчадкі, каб адпачыць ад гарадскога гвалту і абабраць тое невялікае, што саспела на здзічэўшых кустах парэчак, агрэсту ці маліны.

У адрозненне ад іншых, веску Сіні Бор мінаваў гэткі тужлівы лес. Яна выстаяла, выжыла, нават пашырылася. З'явіліся новыя хаты, новыя людзі, новыя законы. Прыйшла новая мода на аграгарадкі. Вясковае кіраўніцтва, згодна з цыркулярам аднекуль зверху, адгрохала цэлую вуліцу аднолькавых, нібы цацачных, домікаў. Стоячы пасярод голага поля, яны выклікалі і зайздасць і непаразуменне – хто ж будзе жыць у гэткіх дамах, хаця і збудаваных па навейшых тэхналогіях і з навейшых матэрыялаў, але ж тымі самымі незграбнымі рукамі, што і дваццаць год назад. Кіраўніцтва лічыла, што такім чынам у веску панаедзе шмат моладзі, прыб'юцца свежыя працоўныя сілы. Але, як і звычайна, кіраўніцтва памылілася. Цацачныя домікі мазолілі вочы мясцовым жыхарам, як і амаль палова закінутых, забытых богам і людзьмі старых хат.

Шмат падзей адбылося за гэтыя дваццаць год. Чаго толькі не перажылі выскоўцы за гэты час, чаго толькі не спазналі. Хварэлі камерцыяй. Кідаўся ў таргоўлю хто толькі мог. На першым паверху канторы прымайстравалася адразу некалькі камерцыйных крам. І хаця асартымент і цэны там былі амаль такія ж, што і ў магазіне, людзі ахвотней ішлі ў камкі, асабліва ў той, дзе быўшая магазіншчыца Нінка таргавала сэканд хэндам, а карацей кажучы абноскамі. А чаго? Мы не гордыя. Можам і ў абносках пахадзіць. Нам не прывыкаць. Ды і навошта плаціць ў трыдарага, калі можна на тыя грошы купіць у тры разы болей? І не важна, што на паліто не хапае гузіка, ці спадніца фарбай заляпана. Рукі есць – гузік прыш'ем, фарбу адмыем і будзем хварсіць у абноўках.

Прайшло колькі год і ад тых камерцыйных крам засталіся толькі ўспаміны. І толькі Нінкіна справа працвятала. Праўда Нінка са сваей гаспадаркай перебралася ў сваю хату. І ўжо не пакупнікі цягнуліся за навінкамі, а сама Нінка званіла суседзям і летала па весцы, прапануючы новыя кофтачкі і амаль ненадзеваныя штаны.

Пасля камерцыі пайшла мода на еўрарамонты. Вось тут выдзелываўся хто як мог. Цягнулі што маглі і адкуль маглі. На старую, сто разоў фарбаваную падлогу клалі лінолеум ці, хто packsзаможней, ламінат. Няроўныя сцены аздаблялі бліскучымі пярэстымі шпалерамі. Столь таксама не заставалася без увагі. Аббівалі гіпсакартонам, фарбавалі ў нязвыклыя колеры, выводзілі розныя мудрагелістыя ўзоры. Не забываліся і пра мэблю. І на змену старым скрыпучым ложкам і канапам прыходзілі мяккія вугалкі і спальныя гарнітуры, якія ледзь-ледзь уцісківаліся ў непрыстасаваныя для іх памераў пакойчыкі. Але што зробіш? Жыцце патрабуе перамен. Усім хацелась жыць не горш, як у горадзе, ці хаця б не горш як у суседзей. Але вось толькі сродкі і магчымасці не кожнаму дазвалялі ўваасабіць жадаючае. Вось і паходзілі тыя еўрарамонты на еўранедадзелкі.

Потым была мода на кветкі. Торкалі іх дзе толькі можна. У старыя шыны, ў іржавыя каструлі, ў дзіравыя тазікі, якія былі раскіданы па ўсяму двару, прымайстраваны на плоце, на сценах. Той, хто быў з рукамі і з фантазіяй, будаваў цэлыя піраміды з рэек і дроту, ўпрыгожваючы

іх дзівоснымі кветкамі, купленымі на базары, прывезеннымі з поўдня, выпісаных па каталогах. Карацей кажучы – вылупляліся, як маглі. Але ўсе гэта на самой справе хараством было толькі на малюнках. Ну не жадаюць галандскія цюльпаны ды паўднёвыя дрэўцы расці на нашай зямельцы. Ды і дагляд за кветкамі патрэбен – паліваць, палоць, падкармліваць. Валтузні шмат. Не кожны адолее. Вось і цвілі тыя кветкі ў тых дварах, дзе гаспадары былі больш уважлівымі і цярплівымі. А ў астатніх клумбы і кветнікі больш паходзілі на густыя заraснікі пустазелля.

Адцвілі кветкі, пачалася мода на святы. Не на тыя, што спрадвечна святкаваліся нашымі продкамі, а на новыя, перанятыя невядома дзе і невядома ў каго. І кожны год нават самая маленькая весачка праводзіла Дзень першага снапа, Дзень першай баразны, Дзень першага снега, Дзень вёскі… Забываліся пра сапрэўшае сена, паедзеную жукамі бульбу, няполатыя градкі і ішлі святкаваць. Шчодра, шчыра. З песнямі, танцамі, выпіўкай, закускай. Рвалі глоткі, збівалі далоні, шануючы ўзнагароджаных жыхароў у самых розных намінацыях – самы лепшы трактарыст, самы лепшы жывелавод, самы лепшы двор і так далей… І штогод намінантаў станавілася ўсе болей і болей. І штогод бібліятэкарка Верка атрымлівала прыз за самыя прыгожыя кветкі. І штогод яна несла дадому чарговы будзільнік і букет, нарванный на ейным жа двары.

Потым… Ды чаго толькі не было потым. Перажылі ўсе. І змены, і крызісы, і грошы ў мяшках насілі, і чаргу за малаком з шасці раніцы займалі, і ўселякія там інфляцыі, дэвальвацыі – словы, пра якія ніколі і не чулі, а тут выпрабавалі на сваей шкуры.

Дваццаць год прайшло… Памяняліся звычкі, устоі. Змяніліся людзі. Сталі нейкія абасобленыя, засмучоныя, азлобленыя. Усе кудысьці спяшаюцца, бягуць, ляцяць. Штось прыдбаць, купіць, памяняць…

І некалі спыніцца, заплюшчыць вочы і надыхацца ліпава-палынным водарам.

Некалі заблукаць у някошанае поле і акунуцца з галавой у рамонкава-званочкавы квецень.

Некалі зайсці да суседа і пабалакаць ні аб чым, пасмяяца над сваей недарэчнасцю, перамыць костачкі вясковаму кіраўніцтву ці сваім сваякам…

І некалі за гэтай мітуснёй і бясконцымі праблемамі, ствараемымі самімі ж, проста жыць.

Жыць, не гледзячы ні на якія перамены і перабудовы.

Жыць, не спяшаючыся і не турбуючыся пра тое, што чакае заўтра.

Жыць, расці, ажаніцца, нараджаць дзяцей і паміраць, калі надыдзе час.

Жыць па сваіх, правераных часам і продкамі, а не па прыдуманных кімсьці законах.

Жыць самім і даваць жыцце іншым.

# Эпапея з сабакам

Нарэшце Пятрова мара здзейснілася. Мара ўсяго ягонага недарэчнага жыцця. Пазбавіўшыся ад каровы і ад уселякіх з ею звязанных турбот, падкапіўшы год за дзесяць, а мо і за болей, прываблівую сумму грошай, Пятро ў згодзе з жонкай купіў машыну. І не якую там небудзь развалюху з рук, а новую, з магазіну, некалькі дзен назад прыгнаную з заводу. Пашанцавала, як кажуць. Ахвочых было шмат, але ж дасталася яна менавіта Пятру. Канечне, тут не абыйшлося без таго, каб камусьці не падмазаць, перад кімсьці не пакланіцца, кагосьці не аблапошыць. Але ж гэта таго стоіла.

Бліскучая, непаразумоўнага пунсовага колеру машына стаяла цяпер у Пятровым двары і мазоліла вочы ўсей весцы.

Пятро не спяшаўся абкатываць сваю пакупку. З ранку і да позняга вечара ен хадзіў кругамі вакол машыны з анучай, старанна і клапатліва сціраючы пыл з капоту. Нават сваей жонцы больш чым за пятнаццаць год сумеснага жыцця ен не аказваў столькі ўвагі, як гэтаму даўно жаданаму набытку. Нінка нават пачала раўнаваць яго да гэтай, як яна выражалася, груды жалеза.

– Ну колькі можна? – абуралась яна. – Ну колькі можна вакол яе хадзіць? Не намілаваўся яшчэ? Не нацалаваўся? Давай ў хату! Вячэра стыне!

Пятро кінуў улюблены позірк на машыну і, не жадаючы спрачацца, накіраваўся у хату. Павячэраўшы, ен яшчэ раз глянуў праз вакно на сваю каханку і лег спаць. Нінка, нагрымеўшыся на кухні каструлямі, некалькі разоў збегаўшы на двор, у хуткім часе падлезла пад мужыковы бок.

Не спалося. Варочалася з боку на бок, пытаючысь заснуць, але сон не йшоў. Ды яшчэ Пятро, як на зло, даваў храпака над самым вухам. Нінка дарма тыкала яго ў бок – Пятро працягваў храпець. Стаміўшыся змагацца с мужыковым храпам і бяссоніцай, Нінка перавярнулася на спіну, закінула рукі за галаву і стала развачаць:

– Трэба заўтра Пятроўне пра грошы напомніць, а то кофту два месяцы назад узяла, а грошы да сяго часу не аддала. Потым трэба Вользе пазваніць, сказаць, каб яна больш не вазіла чаравікі трыццаць шостага памеру. У нас такія нават дзеці не носяць. Павымахалі ўсе! Толькі розуму не набраліся. Ды што малыя? Тут у дарослых з розумам праблемы. Вунь, як храпіць. А што яму? У яго галава ні аб чым не баліць. Устаў, пад'еў і пайшоў сабе па весцы шоргацца. Нічога яму не трэба – толькі з машынай сваей гуляе.

Нінка перавяла погляд на вакно. Там на двары, ззяючы ў месяцовым святле свежай пунсовай фарбай, стаяла новенькае аўто.

– Але ж з машынай добра, – супакойвала яна сама сябе. – Не трэба нікога прасіць. Нікому кланяцца. Сеў, ды паехаў, куды захочаш. Хочаш у лес, хочаш – у горад. Праўда на бензін прыходзіцца траціцца, але што зробіш? Дарагія рэчы патрабуюць затрат. Ды і куды зараз без транспарту?

Нінка зноў зірнула ў вакно. Машына стаяла на месцы.

– Толькі клопату з ей. Ужо колькі Пятру кажу – зрабі гараж. Вунь колькі пра крадзяжы гавораць. Нават банкі ў горадзе грабяць. Сейфы ўскрываюць. А тут што? Веска. І не ўпільнуеш. А потым шукай, дзе хочаш. Ды і хто шукаць будзе? Івончык на пенсіі. А новы ўчастковы – бясплатны дадатак да часопіса «Мурзілка». Карысці з яго аніякай.

Нінка прыслухалася. На двары сонна гаўкаў Тузік. Пятро прывалок сабаку ад сваяка ў той жа дзень, калі купілі машыну. Сабака быў ладны, народзісты. Пятру не раз прапанавалі прадаць сабаку. Грошы немалыя давалі. Той толькі аднеківаўся. Такі сабака і самаму патрэбны. Вялікі, амаль з цяля, чорны, мардасты Тузік нікога, акрамя Пятра да сабе не падпускаў. Нават на Нінку рычаў і пазіраў коса. У такога не тое што машыну з пад носу, травіну ля дарогі не адарвеш.

Толькі вось назвалі яго смешна – Тузік. Для такой тварыны самае імя было б Д’ябал, альбо Чорт.

Нінка яшчэ раз прыслухалася. Тузік заціх.

– Заснуў пэўна, – падумала Нінка і пазіхнула.

Пятро перавярнуўся на другі бок і перастаў храпець.

– Слава богу! – Нінка падбіла падушку. – Заўтра нікуды яго не пушчу. Ні на якую рыбу, ні ў якія грыбы. Хай гараж будуе. Хутка дажды пачнуцца, што з машынай станецца? Такія ж грошы плочаны!

Нінка яшчэ раз салодка пазіхнула і не заўважыла, як заснула.

Прачнулася яна ад лязгату ў карыдоры і мацюкання Пятра.

– Тваю макаўку! – абураўся мужык. – Не, ты толькі паглядзі! Паразіты! Рукі, ногі ім паабрываць!

– Што здарылася? – Нінка перапалохана ўскачыла з ложку. – Ніяк машыну ўкралі?

– Ды не! – Пятро кінуўся камусьці названіваць. – З машынай усе ў парадку. Тузіка сперлі!

– Як гэта сперлі? – не зразумела Нінка.

– А вось так! – Пятро нярвова круціў тэлефонны дыск. – Далі яму напэўна нейкай трасцы, каб ен заснуў і сперлі. Паразіты!

– Мо сам адарваўся?

– Адарваўся! З такога ланцугу не адарвешся. Ды і ашэйнік ля будкі валяецца. Сам жа ен не мог яго зняць.

– Не мог, – пагадзілася Нінка.

– Каб ім павылазіла ўсім! – не сціхаў Пятро. – Такія грошы – кату пад хвост.

– Якія грошы? – здзівілася Нінка.

– А ты думаеш сваяк мне дарма такога сабаку аддаў? Зараз табе! Ведаеш, колькі такія шчанюкі ў горадзе каштуюць?

Нінка нічога на гэта не адказала. Галоўнае, што машына была ў сахраннасц,. а Тузік яе ніколечкі не турбаваў.

– А каму гэта ты названіваеш? – пацікавілася Нінка, прыймаючыся гатаваць снеданак.

– Новаму ўчастковаму. Як яго там? Камарову.

– Найшоў каму званіць! – усміхнулася Нінка. – Ды і што ты яму скажаш? Што ў цябе сабаку сперлі? На смех толькі сябе падымеш. Людзі прападаюць і нікому справы няма. А тут сабака!

Пятро паразважаў хвілінку і паклаў трубку на месца. Потым устаў, пашоргаў у шафе і накіраваўся на вуліцу.

– Куды ты? А есці?

– Потым! – адмахнуўся Пятро і выйшаў з хаты.

З«явіўся пад вечар. Хмуры і злы.

– Ну і дзе ты шастаў? – накінулася Нінка на мужыка. – Я ўжо і не ведала што думаць. Падаўся кудысьці, ні слова не сказаў.

– Па справах хадзіў, – незадаволена прабурчэў Пятро.

– Па якіх яшчэ справах? – не зразумела Нінка.

– Там, на двары… – Пятро махнуў рукой. – Сама ўбачыш.

Нінка выскачыла на двор. Хвілін праз пяць яна ўскачыла ў хату і залямантавала:

– Табе што рабіць больш няма чаго? Табе грошы дзяваць некуды? Навошта ты гэтага шчанюка прыпер? Табе аднаго мала было? Хочаш, каб і гэтага сперлі?

– Не сапруць, – Пятро прапускаў міма вушэй жонкін лямант.

– Не сапруць! – не сціхала Нінка. – Калі Тузіка сперлі, гэтага і падаўна сапруць.

– Ну гэта мы яшчэ паглядзім, – Пятро хітра пасмейваўся.

Нінка плюнула і не жадаючы больш спрачацца, занялася хатнімі справамі.

– Ведаеш, што, – толькі і сказала яна, – калі заўтра за гараж не прыймешся, сам напару са сваім сабакам будзеш машыну пільнаваць! Зразумела табе?

Пятро прамаўчаў.

Ноч зноў не спалі. Прыслухоўваліся. Пятро на гэты раз запіхнуў сабаку ў аўтамабіль. Калі хто спакусіцца на жывеліну – не дастане, а калі хто пазарыцца на машыну – сабака падыме гвалт. Але на двары было ціха.

– Нінка праўду кажа, – разважаў Пятро, – трэба гараж будаваць. Колькі машыне на двары стаяць? Ды і інструмент будзе куды скласці. Нінка колькі разоў намагалася яго з кладоўцы выкінуць. Усе! Заўтра пайду да Міколы, калі той будзе цвярозы, і пачнем. Дня за тры, думаю, збудуем. Галоўнае дах навесці, а там…

Пятро павярнуўся да сцяны і ціха захрапеў.

Нінка таксама ціха пасапывала на вуха мужыку. Гэтая гульня з сабакамі, з незбудаваным гаражом і начнымі вартамі ей парадкам надакучыла. Заўтра, вырашыла яна, Пятру прадыхнуць не дам, пакуль не збудуе гараж і не пазбавіцца ад сабакі. Заўтра. А пакуль спаць.

Ранкам лямантаваў Пятро. Сонная Нінка нават не зразумела, што здарылася. Накінуўшы халат, яна выскачыла на двор. Пятро насіўся кругамі вакол машыны і равеў:

– Ды што гэта за трасца такая? Не, ты паглядзі на яго! Мала таго, што ен у машыне нагадзіў, дык ен і аббіўку ўсю падрапаў! Чорт бы пабраў сваяка з яго сабакамі!

Зразумеўшы ў чым справа, Нінка адразу кінулася ў атаку:

– Вось што, Пятро, мне гэта ўжо папярок горла стаіць. Цягні гэтага сабаку адкуль прыпер! Каб я яго больш не бачыла! І больш ніякіх сабак! Ты мяне чуеш? Ніякіх! А наконт машыны… Як хочаш, але каб сення ж к вечару гараж стаяў! А то ты сам замест сабакі будзеш…

І Нінка прыпомніла яшчэ з пару-тройку мужніных грахоў. Выгаварылася, выліла ўсе, што набалела і вярнулася ў хату.

Пятро тужліва пагледзеў на падраную аббіўку, на ласціўшагася ля ног сабаку і нехаця накіраваўся да Міколы.

Увечары ўсе было гатова. Сабака адправіўся назад да сваяка, а новая машына стаяла ў новым гаражы. Пра тое, каб абмыць справу Пятро нават і не заікаўся. З Міколай расплаціліся бутэлькай гарэлкі. Грошы браць ен не стаў, затое не адмовіўся ад вядра мінулагодняй бульбы і трохлітровага слоіка з саленымі гуркамі.

Пакуль ішло будаўніцтва, Нінка носу на двор не паказвала. Корчыла з сябе пакрыўджаную. Толькі позна вечарам, выносячы смецце, яна, нібы ненацкам, абыйшла гараж з усіх бакоў, прыймаючы работу.

– Можа, калі хоча! – задаволена бухцела яна. – Вунь які ладны гараж атрымаўся. Нават жыць можна. А ўсе рукі не даходзілі! Каб не гэтыя сабакі, то і невядома колькі б яшчэ чакаць давялося.

Нінка памацала замок, правяраючы ці закрыты, і вярнулася ў хату.

У гэтую ноч яны з Пятром спалі спакойна.

# Цюльпаны

Верка корпалася ў гародзе. Нарэшце зацвіталі модныя галандскія цюльпаны, па якіх яна даўно млела. Яна калісьці выгледзела іх у нейкім каталозе, але доўга не рашалася заказаць. Палохала цана, ды і, наслухаўшысь розных баек пра несур'езных таргашоў, не рызыкавала выкі- нуць грошы на вецер. Потым плюнула на ўсе і выпісала тры цыбулінкі. Доўга чакала. Ужо нават пачала сумнявацца, што ейная мара здейсніцца. Папракала сябе, што адправіла грошы, і не малыя, ў мінкін мех. Але не прайшло і месяца, як прыйшла бандэролька з доўгачаканымі цыбулінкамі. І Верка супакоілася.

Месца для новых кветак выбрала самае сонечнае, якраз насупраць дарогі. Хай усе глядзяць, якія ў яе кветкі. Глядзяць і зайздросцяць. Але замежныя кветкі аніяк не жадалі ўзыходзіць. Верка зноў пачала турбавацца. Мо, цыбулінкі дрэнныя? Мо, папсаваліся ў дарозе? Мо, гэты зусім не цюльпаны? Але ўсе сумненні аказаліся дарэмнымі. Цыбулінкі хутка выпусцілі першыя лісточкі, а следам за імі і стрэлкі. Якіх-небудзь яшчэ пару дзен і Верка ўбачыць сваю мару ў поўнай красе. Па некалькі раз на дню яна бегала да сваіх кветачак – палівала, рыхліла зямельку, вырывала пустазелле, накрывала ад ветру і тумаоў. Новые кветкі так захапілі яе, што яна нават забылася пра ўсе астатнія, запаланіўшыя амаль увесь гарод.

У нядзелю, прыбраўшыся ў хаце, Верка зноў корпалася ў градках.

– А што ты робіш? – пачуўся танюткі дзіцячы галасок. Верка азірнулася. Ля плоту стаяла дзяўчынка гадоў трох-чатрырох. У вялікіх гумавых ботах, чырвонай куртцы з чужога пляча і ўзлахмачанай галавой.

Дзіце са здзіўленнем сачыла за Верцынай справай.

– Прыгожыя ў цябе кветкі, – не чакаючы адказу прадоўжыла дзяўчына. – А цябе як завуць?

– Верай.

– А мяне Лізай.

– Чыя ж ты такая бойкая будзеш? – запытался Верка.

– Мамкіна.

– А мамка дзе?

– На рабоце.

– А татка твой дзе?

– А таткі няма, – нікольki не саромеючысь адказала дзяўчынка.

– Дык ты адна гуляеш?

– Адна. Баба ў магазін пайшла, а я сюды.

– А бабу як зваць?

– Баба.

– А жывеш ты дзе?

– У горадзе.

– А што ты тут робіш?

– Мяне да бабы прывязлі. Яна ў магазін пайшла, а я сюды.

– Табе, пэўна дадому пара ісці? Баба хваляваецца будзе.

– Не, не будзе! А гэта ў цябе што? – Лізка ткнула пальчыкам на прыкрытыя ад ветру цюльпаны.

– Кветкі.

– А нашто ты іх закрыла?

– Каб ноччу не замерзлі, – Верка зняла мяшок.

– Хіба ім холадна бывае? – ўсміхнулася дзеўчына.

– Бывае.

– А як яны называюцца?

– Цюльпаны.

– А чаму яны не цвітуць?

– Рана яшчэ. Праз пару дзен зацвітуць. Вось тады і прыходзь на іх паглядзець.

– Прыду, – матнула галавой дзяўчынка.

– Лізка, чорт цябе бяры! – пачуўся аднекуль крык. – Я ўсю веску абегала, а ты вось дзе!

– Здароў, Іванаўна, – Верка прывіталася з падляцеўшай да плоту кабецінай.

– Здарованькі! – баба хапалася за сэрца.

– Твая? – Верка кіўнула на дзеўчыну.

– Мая, – Іванаўна перавяла дух. – Дачка на сесію паехала. Вучыцца значыцца, а гэту недарэчнасць мне падкінула. Не дзіценак, а чорт! Пасядзі, кажу адна ў хаце, пакуль у магазін збегаю. Дык не! Я за дзверы і яна следам. А каб сышла куды? Што б я рабіла? Дзе б я яе шукала?

– Шустрая яна ў цябе, – заўважыла Верка.

– Шустрэй не прыдумаеш, – Іванаўна падпіхнула ўнучку і патопала дадому.

Верка нейкі час глядзела, як старая і малая кавыляюць па дарозе. Старая мацюкаючыся, а малая штосьці весела рассказваючы.

Паглядзела, неяк сумна уздыхнула і зноў прынялася корпацца са сваімі кветкамі.

Выхадны скончыўся. Назаўтра, накіроўваючыся на работу, Верка не прамінула паглядзець на свае цюльпаны. Кветкі пачалі распускацца. На самой справе яны аказаліс яшчэ прыгажэйшымі, чым на фатаграфіі. Цемна-чырвоныя, амаль чорныя пялесткі з белымі пражыкамі і махровымі краямі. Два з іх ужо поўнасцю распусціліся, а трэцці быў ужо нагатове раскрыць свой венчык насустрач сонейку.

– Гэта ж які трэба мець розум, каб такое вывесці! – Верка не магла налюбавацца кветкамі. – Усе. На наступны год выпішу яшчэ. Чорт іх бяры грошы! На такое хараство ніякіх грошай не шкада.

Верка паправіла ўтыканыя ў зямлю колышкі, кінула развітальны позірк на цюльпаны і няспешна пайшла па пыльнай дарозе ў напрамку бібліятэкі.

Дзесці пад абед у дзвярах бібліятэкі з'явілася Лізка.

– Так ты тут працуеш? – не прывітаючыся запытала дзеўчына.

– Тут, – кіўнула галавой Верка.

– А ты разумная, – дзяўчына абвяла позіркам паліцы з кнігамі.

– З чаго ты узяла?

– Столькі кніжак! І ты іх усе прачытала?

– Не, не ўсе.

– А я чытаць яшчэ не ўмею, – больш з гонарам, чым з жалем прагаварыла малая.

– Навучышся, – запакоіла яе Верка.

– Ага! – дзеўчына кіўнула галавой і стала разглядваць паліцы.

– А ты зноў ад бабы збегла? – пацікавілась Верка.

– Не. Яна сама сказала – каб мае вочы цябе больш не бачылі. Ну я і пайшла. Дома ў цябе закрыта. На вуліцы гуляць не з кім.

– А сюды як завітала?

– Па дарозе.

Верка ўсміхнулася.

– А з карцінкамі ў цябе кніжкі есць? – малая зачаравана глядзела на доўгія паліцы, застаўленыя тоўстымі і тонкімі кніжкамі.

– Есць, – Верка накіравалася да шафы. – Табе казкі, альбо яшчэ што?

– Не. – Лізка закруціла носам. – Казкі не трэба. Я іх не люблю.

– Першы раз бачу чалавека, які не любіць казкі, – Верка зачыніла шафу і падыйшла да дзеўчыны. – А што ты тады любіш?

– Мне лепш што-небудзь з кветкамі. Дзе малюнкаў многа.

– Добра. Вось табе з кветкамі, – Верка падала малой некалькі часопісаў. – Тут глядзець будзеш, ці дома?

– Тут пагляджу, – дзеўчына ўзлезла на стул і пачала гартаць часопісы. – А тут няма такіх, якія ў цябе растуць. Твае цюльпаны ўжо цвітуць. Я бачыла. Прыгожыя. Ты іх у вазачку пастаў – будзе яшчэ прыгажэй.

– Навошта? – здівілася Верка. – У вазе яны хутка завянуць. А так будуць доўга цвісці.

– Цэлы год?

– Ну не год, а тыдзень. Мо і боле.

– І ўсе? – Лізка насупілася.

– І ўсе. Кветкі доўга не цвітуць.

– Цукерку хочаш? – малая забылася пра часопісы, дастала з кішэні дзве пакамячаныя шакаладныя цукеркі і працянула іх Верцы.

– Еш сама, – пачала аднеківаццa тая.

– Я ўжо наелася. У бабы іх многа, – Лізка запіхнула цукеркі назад у кішэню і зноў пачала гортаць старонкі. – А ты ў госці любіш хадзіць?

– У госці? – здзіўлена пераспрасіла Верка.

– Ну. У госці.

– Не ведаю. Я пра гэта ніколі не думала.

– Якая ты смешная! Усе любяць хадзіць у госці. Хочаш, я да цябе ў госці прыйду? Ты не хвалюйся. Я ведаю, як у госці ходзяць. Канфеты ў мяне есць, а кветак я знайду. Ты кветкі любіш?

– Люблю.

– Ну, ўсе! – малая паклала часопісы на месца, злезла са стула і накіравалася да выхаду. – Чакай мяне у госці.

– А часопісы? Ты іх з сабой браць не будзеш?

– Некалі мне! – зусім па даросламу адказала дзяўчына і знікла за дзвярамі.

– Ну і дзіце! – Верка паклала часопісы на месца. – Бедная Іванаўна! І як яна з ей спраўляецца? Даў бог на старасці гадоў падарунак.

Верка села на месца і прынялася лістаць новы каталог кветак, прыкідваючы на якія яшчэ цуды прыроды і айчыннай ці замежнай селекцыі яна адшкадуе грошай. Ейны позірк зноў прыцягнулі цюльпаны. На гэты раз яны былі нейкага непаразумелага сіняга колеру.

– Няўжо такія бываюць на самой справе? – падумала Верка і штосьці екнула ўнутры. Яна адклала каталог у бок, зачыніла бібліятэку і бягом кінулася дадому. Пачуцце яе не падманула. На месцы, дзе раніцой квітнелі дзівосныя галандскія цюльпаны зараз былі адны тычкі.

– А божачкі мой! – залямантавала Верка. – А што ж гэта такое робіцца? А каму гэта рукі дзяваць некуды?

Верка кінулася да хаты. Адшукаўшы ключ, што хавала пад ганкам, адчыніл замок, куляй уляцела на кухню і абамлела.

На стале ляжалі цемна-чырвоныя, амаль чорныя з белымі пражылкамі і махровымі краямі цюльпаны. А побач з імі дзве пакамячаныя шакаладныя цукеркі.

# Суперцэмент

Пад вечар Пятроўна вазілася з дравамі і лаяла Дразда.

– А каб табе пуста было! Казала ж – хай на вуліцы ляжаць. Дык не! Змокнуць, кажа! У хляўчук іх запер. Змокнуць не змоклі, а сапрэць – сапрэлі! Цэльную машыну дроў спаганіў. Куды іх цяпер? Не дровы – адно гнілле!

Пятроўна шпарка выкідвала дровы з хляўчука на вуліцу і паглядала на неба. Па небе беглі хмаркі, збіваючыся ў кучу, прадвяшчая неўзабаве дождж.

– А што гэта ты на ноч гледзячы з дравамі гуляеш? – на двары з’явілася старая Дуся. Ледзь перастаўляючы ногі, яна дакуляла да ганку і цяжка апусцілася на лавачку.

– А цябе чаго на ноч гледзячы носіць? – у тон старой запытала Пятроўна.

– Прайші тыя гадочкі, – сумна прасіпела Дуся, – калі я насілася. Зараз больш поўзаю.

– Паміраць не збіраешся? – пажартавала Пятроўна.

– Ды дзе там! – адмахнулася старая. – Бог пра мяне забыўся, а чорт не бярэ. Вось і капчу неба.

– Ну-ну! – Пятроўна зноўку накінулася на дровы.

– Я чаго прыйшла, – Дуся канцом хусткі абцерла твар. – Ці няма ў цябе хоць крышачку цэменту? Упрасіла Валерку каб на могілкі з’ездзіў. Бацькін помнік зусім на бок заваліўся. Падмазаць трэба. Я ў магазін зайшла, а там толькі мяшкамі прадаюць. А навошта мне мяшок? Мне б трошачкі. Ці есць?

Пятроўна выпрамілася.

– Дзесьці быў. Дрозд ганак заўчора падмазваў. Мо і застаўся.

– Мне трошачку. Помнік падмазаць, – Дуся дастала з кішэні цалафанавы пакет.

– Зараз пагляджу, – Пятроўна адчыніла сарайчык. Дуся зпаўзла з лаўкі і патупала следам.

– Мне поўмяшочка, – гундзела старая. – Валерка заўтра ў тым баку будзе, дык абяцаў падмазаць. Помнік зусім набок заваліўся. А ў магазіне толькі мяшкамі прадаюць. А навошта мне мяшок?

– Чорт яго бяры, гэтага Дразда! – мацюкалася Пятроўна, поўзаючы сярод розных мяхоў, скрынь, каробак і рознага хламу, які ейны мужык натаскаў з уселякіх сметнікаў. – Колькі раз казала – выкіні ламачча вон! Ды дзе там! Усе патрэбна! Усе ў справу пойдзе! Кожную жалязяку дамой цягне.

– Гаспадарлівы, – заўважыла Дуся. – А мой – усе з хаты прэ. Заўчора чугунок дзіравы знес. А я ў ім часнок захоўвала.

– Здаецца знайшла! – Пятроўна расчыніла нейкі мех. – Пэўна гэта. Давай свой пакет.

– Мне поўторбачкі. Многа не трэба.

– Ды мне што? Шкада? – Пятроўна нейкай банкай насыпала шэры парашок у пакет. – Нейкі ен дзіўны! Цэмент звычайна цемны, а гэты занадта светлы.

– Мо так і трэба, – Дуся сачыла, каб Пятроўна насыпала паболей.

– А хто яго ведае? – Пятроўна моршчылася ад шызага пылу. – Мо зараз такі цэмент выпускаюць.

– Мо і выпускаюць, – пагадзілася старая. – Я сама чула, што есць нейкі суперцэмент – нават замест клею можна выкарыстаць.

– Дык гэта і есць клей! – усміхнулася Пятроўна. – Суперцэмент называецца. Я такі купляла. Толькі ўсе хлусня. Акрамя паперы ен нічога не клеіць. Я тапкі хацела падклеіць – ды дзе там! Разваліліся на другі дзень.

– Хопіць, родненькая, – Дуся прытармазіла кабеціну. – Разыйшлася. Амаль поўны насыпала. І не данясу.

– Ну высыпаць назад не буду, – Пятроўна закруціла мех, адкінула банку і накіравалася на вуліцу.

Дуся патупала следам. Пятроўна паставіла мяшэчак на зямлю і прысела на лаўку. Дуся прымайстрылася побач.

– Дзякуй табе. А то у магазіне кажуць – бяры, бабка мяшок. А навошта мне мяшок? Мне трошачкі трэба – помнік падмазаць. Валерка заўтра ў тым баку будзе – справіць. Я б і сама падмазала, ды не дайду. Дзюжа далека. Я ў той бок толькі з музыкай паеду ды з вянкамі.

– Кінь! – махнула рукой Пятроўна. – Ты яшчэ ўсіх нас перажывеш.

Дуся толькі паківала галавой.

– Ладна, родненькая, – старая палезла ў кішэнь. – Дзякуй. А гэта табе.

Дуся працягнула некалькі скамячаных паперак.

– Ты што? – абурылася Пятроўна. – Нутка схавай свае грошы! Гляньце на яе – багацейка знайшлася. Схавай грошы, табе кажу, а то больш нічога не дам.

– Ну дык… – соўгала носам старая. – Вазьмі хоць Дразду на піва.

– Шыш яму, а не піва! – Пятроўна ўскачыла з лаўкі. – Ен машыну дроў згнаіў, а ты яго півам частаваць задумала! Схавай грошы! А то пакрыўджуся!

– Ну калі грошы не бярэш, – старая запіхнула паперкі назад у кішэню, – тады я табе яек прынясу. Куры, слава богу, яшчэ нясуцца.

– Няўжо ў цябе яшчэ і куры есць?

– Есць, – старая цяжка ўздыхнула. – Тры курыцы і певень. Валерка кажа – давай на суп заб’ем. Ды мне шкада. Як-ніяк, а гаспадарка. Гарод ужо не саджу. сіл Каровы даўно ўжо няма. Вось толькі куры і засталіся.

– А я сваю жыўнасць даўно звяла, – Пятроўна махнула рукой на пусты хлеў. – Карысці аніякай. У магазіне дзешавей купіць таго мяса ці малака, чым скаціну выгадаваць. Ды і доглядаць трэба. Сена касіць…

– Аблянелі, – Дуся падхапіла мяшочак і патупала да каліткі. – Толькі спаць ды гуляць. Хаця, мо яно так і спакайней. Спіну гнуць не трэба, ды рукі пэцкаць. Ну, пайду я. Дзякуй за цэмент. А яйкі я табе заўтра з унучкамі перадам.

– Не выдумывай! – аднеківалася Пятроўна. – Абыйдуся я і без яек. У магазіне куплю. Мо памагчы данесці?

– Не. Я сама датупаю. Спяшыць мне некуды. Ды і свая ноша рук не цягне.

– Ну як хочаш.

Пятроўна праводзіла старую да каліткі. Пастаяла трошкі. Дачакалася, калі старая знікне за паваротам.

– Не, не хачу да такіх год дажываць, – Пятроўна здрыганулася. – Яшчэ гадкоў дваццаць пажыць і хопіць на мой век. Хаця тут не згадаеш.

Пятроўна паглядзела на неба і зноў кінулася выкідваць дровы з хляўчука на вуліцу.

Назаўтра з дровамі гуляў Дрозд. Ен зносіў іх назад у хляўчук і лаяў жонку:

– Казаў жа ей – не чапай! Сам спарадкую. Не – рукі дзяваць некуды! Трэба было дровы павыкідываць! А калі б дождж пайшоу? Дзе іх сушыць? Ну заплеснелі трошкі. Ну і чаго лямант падымаць? У сараі і не такія ляжаць. Рабіць мне больш нечага, як дровы з месца на месца перакідваць.

– Здарова, Дрозд, – ззаду пачуўся нечы голас. – Што гэта ты з дровамі гуляеш?

Дрозд выпраміўся. Ля каліткі стаяў Валерка.

– А вось размяцца трошкі вырашыў. Надвор’е добрае. Дай, думаю, дровы пакідаю туды-сюды.

– Ну-ну! – ўсміхнуўся Валерка. – Калі ахвота будзе – прыходзь да мяне. У мяне там два трактары не колатых. І разамнешся, і падсобіш.

– Яны у цябе ўжо другі год няколатыя ляжаць.

– А па мне хоць і тры. Я сабе як паравое паставіў, дык дроў зусім мала трэба. А ты не збіраешся сабе ставіць?

– Што ставіць? – не зразумеў Дрозд.

– Паравое. Калі надумеш, пазаві. Я табе мігам зраблю.

– Ды мне і печка пакуль не мешае.

– Ну як хочаш! – Валерка накіраваўся прэч.

– Пачакай! – аклікнуў яго Дрозд. – А ты чаго прыходзіў?

– Да так! Спытаць. Матка ў цябе ўчора цэмент брала. Дык нейкі ен дзіўны.

– Цэмент? – Пятро не разумеў, пра што ідзе гаворка. – Які цэмент?

– Ды помнік трэба было падмазаць. Ды вось, кажу, нейкі незразумелы цэмент. Светлы. Не застывае. Намучыўся. Можа стары быў? Хаця і стары цэмент добра застывае. Дык вось я і рашыў запытаць, што гэта ў цябе за трасца такая?

Дрозд непаразумела хлопаў вачыма, потым пагледзеў на сарай, на Валерку, зноў на сарай і зарагатаў.

– Чаго ты? – спалохаўся Валерка. – Крышу знясло?

– Ну бабы! Ну дуры! Гэта ж не цэмент быў!

– Як не цэмент? А што?

– Цэмент я заўчора ўвесь на ганак зрасходваў. А гэта ў мяшку даламітка была. Ну, мая па дабраце душы тваей матке і насыпала.

– Тваю макаўку! – Валерка плюнуў. – А я як дурны паўдня чакаў, пакуль застыне.

– Ну і як? – Дрозд перастаў рагатаць.

– Што як? Трымаецца. Як і нада быць, – Валерка накіраваўся прэч.

– Ты калі трэба, – крыкнуў Дрозд уваслед, – прыходзь. Я табе яшчэ такога цэменту насыплю. А калі не паленешся – схадзі за ферму. Там яго цэльная гара.

Дрозд хіхікнуў і зноў прыняўся зносіць дровы ў хляўчук.

# Цешча

Генка смяяўся:

– Калі і есць анекдоты пра цешчу, то яны ўсе пра мяне. Каб я ведаў, што так атрымаецца, ніколі б не ажаніўся. Колькі з цешчай разам жывем, два разы толькі і пагаварылі. Адзін раз яна мяне аблаяла. Другі раз я яе. Вось і ўся рамова. А пра што нам з ею размаўляць? У яе свае інтарэсы, ў мяне свае. А агульных ні воднага.

– А колькі ей гадоў? – запытаўся Васіль.

– А чорт яго ведае! – Генка пацiснуў плячамі. – Не то шэсцьдзесят тры, не то шэсцьдзесят чатыры.

– Добры зяць! – усміхнуўся Сяргей. – Нават не помніць, колькі цешчы гадоў.

– Было б чым галаву дурніць! – адмахнуўся Генка. – Мяне такая матэматыка не займае.

– Тут год з дваццаць яшчэ патрымаць давядзецца, – прадоўжыў Сергей. – У маей жонкі адна бабуля дажыла да дзевяноста шасці, а другая – да дзевяноста васьмі.

– Гэта ты сваім зяцям расскажаш, – надзьмуўся Генка, – каб ведалі, што іх чакае. Самае смешнае – жаніцьба, як у той рэкламе – бярэш адну рэч і бясплатна атрымліваеш другую. Бярэш жонку, а ўдабавак і цешчу ўпрыдачу. А самае крыўднае, што ў майго брацельніка было две жонкі і ніводнай цешчы. Трэцці раз недарэка надумаў ажаніцца – і зноў падфарціла – зноў без цешчы. А тут на днях выпадак быў… Звоніць мне малая, раве ў голас. Баба, кажа, забілася. А я і не ведаю – ці то плакаць, ці то радавацца. Я рукі ў ногі і дадому. А ей хоць бы хны! Лезла на шафу – з табурэткі грымнулася. Толькі руку пабіла. А шкада… Калі б галавой ляснулась, мо там бы зварухнулась нешта – паразумнела б хоць крышачку.

– Не любіш ты яе, – заўважыў Сяргей.

– Не люблю, – пагадзіўся Генка. – У нас гэта ўзаемна.

– Ну, – Васіль пацягнуўся, – досыць пра цешчу. Давайце, лепш, вып’ем. Каб нас гэткая трасца мінула.

– Давайце вып’ем, – падхапілі прапанову Сяргей з Генкам.

Налілі, чокнуліся, выпілі, закусілі.

Генка зноў пачаў распавядаць:

– У ва ўсіх цешча, як цешча, а ў мяне мегера. Што прыдумала! У будні дзень спіць да абеду, а як выхадны – ўзапрэцца ні свет, ні зара, і грымець пачынае. Два дні ў тыдні, калі паспаць можна, ды дзе там! Паспіш! Як назло робіць!

– А пагаварыць з ей не спрабаваў?

– З ею пагаворыш! – успыхнуў Генка. – Яна ж адразу ў слезы кідаецца! Усе вакол вінаватыя. Усе навакол гады і паразіты. Адна яна анел.

– Не, – Сяргей спачувальна ўздыхнуў, – мая не такая.

– А у мяне цешчы і зусім няма, – дадаў Васіль. – Памерла.

– А хочаш, я табе сваю на пракат дам? – прапанаваў Генка. – Ды яшчэ і прыплачу.

– Не, – Васіль пакруціў галавой. – Твая цешча, ты з ею і ваюй.

– Ваюй! – нахмурыўся Генка. – Тут не вайна, а кругавая абарона. Ранкам не ведаеш, з якой яна нагі ўстала. Увечары не ведаеш, з якім настроем спаць ляжа. І то ей не так, і гэта не гэтак.

– На тое яна і цешча, – усміхнуўся Васіль.

– А ну яе! – Генка махнуў рукой. – Давайце лепш вып’ем!

– І то праўда, – пагадзіліся Васіль і Сяргей. – Давайце вып’ем.

Налілі, чокнуліся, выпілі, закусілі.

Генка зноў завеў размову:

– А з другога боку, і ад яе карысць нейкая есць. І дзеці дагледжаны, і сабака не патрэбен. І на машыну сігналізацыю ставіць не трэба. Вось каб толькі хто ей язык падрэзаў…

Генка гаварыў усе цішэй і цішэй, перамежваючы словы з пазіханнямі.

– Ды і яе зразумець можна… Адна ў хаце… Ні пагаварыць не з кім, ні паспрачацца…

– А жонка? Дзеці?

– У дзяцей свае інтарэсы. Баба ім не патрэбна. А жонка…

Генка салодка пазіхнуў.

– А жонцы таксама не да яе. У яе сваіх спраў поўна. І дзернуў мяне чорт тады жонку паслухаць… Да цешчы жыць пайсці… Хаця, чаго я жалюся? Сам вінаваты…

Генка замоўк.

– А ну цябе, з тваей цешчай! – Сяргею надакучыў бясконцы Генкін маналог. – Двайце лепш вып'ем.

– Давайце вып'ем, – падхапіў Васіль. – Генка, ты як?

Адказу не было. Схіліўшы галаву на стол, салодка чмокаючы вуснамі, Генка спаў.

# Спека

Такога пекла, што ўсталявалася ў гэтае лета, даўно не бачылі. І раней былі дні, калі слупок тэрмометра пыдымаўся больш за трыццаць градусаў, але каб такая спека трымалася амаль месяц, з сіняборскіх старажылаў не помніў ніхто. З аднаго боку – яно на тое і лета, каб пагрэцца. А з другога – вытрываць такія выбрыкі прыроды не ўсім было пад сілу. Вялі расліны, жывеліны шукалі сховішча ў цяні. А што ўжо казаць пра людзей? Добра малым і маладым – яны да абеду спалі, а потым да самага змяркання прападалі на рэчцы. А што рабіць дарослым? Хочаш, не хочаш, а на працу хадзіць трэба, ды і хатнія справы на заўтра не адкладзеш. Вось і маяліся ў душных памяшканнях, пакутвалі пад пякучымі промнямі ў гародах, праклінаая лета, спеку, сонца і яшчэ невядома каго. Плавіліся мазгі, цела агортавала млявасць, хацелася прахалоды, снегу і зімы. Але ж цяжэй за ўсе даводзілася хворым і старым. Такое надвор'е для іх было сапраўдным катаваннем, спасу ад якога не было нідзе.

Старая Дуся паціху тупала з магазіну. Праз дзесяць крокаў спынялася, выцірала твар канцом хусткі, сумна ўздыхала і крочыла далей.

Нейкая машына абагнала яе і спынілася побач.

– Падвезці? – з вакенца высунуўся чырвоны, ў колер машыны, твар Івончыка.

– Ды, не! – адмахнулася старая. – Сама датупаю. Тут недалека.

– Ну, як пажадаеш, – Івончык не стаў навязвацца. Машына ўзраўла і знікла за паваротам.

– У такое пекла толькі на машыне і ездзіць! – незадаволена заўважыла Дуся і прадоўжыла свой шлях.

Яшчэ поўгадзіны і яна нарэшце завярнула ў свой двор.

– Вось і датупала, – старая паставіла торбачку з харчамі на ганак, зняможана апусцілася на лавачку.

З кожным годам шлях ад дому да магазіну для яе станавіўся ўсе даўжэй і даўжэй. Суседзі кідаліся з дапамогай, але старая аднеківалася:

– Не магу я ў хаце днямі сядзець! Хоць у магазін схаджу. З людзямі пагутару, навіны пачую. Цяжка, але што зробіш? Хоць такая забава.

Нікуды, акрамя як у магазін Дуся больш не хадзіла. Большую частку яна сядзела ў хаце, паглядая на навакольны свет параз вакенца. Тэлевізар у Дусі быў, але там згарэла нейкая лямпа. Валерка, Дусін сын, некалькі разоў вазіў яго ў рамонт, ды там кожны раз казалі, что такіх лямп ужо даўно няма. Трэба купляць новы тэлевізар. Ды дзе ўзяць на яго грошы? Ды і бачыла Дуся дрэнна. Ды і глядзець асабліва нечага. Вось і бавіла старая час назіраннем за тым, што тварылася за вакном.

А сонца паліла няшчадна. На небе ні хмаркі, ні воблачка, ні намека на тое, што гарачыня спадзе.

– Згарыць усе, – разважала Дуся. – Мне што, а ў людзей гароды! Калі дажду не будзе, згарыць бульба. А як жа без яе? Без яе ніяк. У нас усе так – то залье, то засушыць. Аніякага парадку не стала. Балоты асушылі, перапахалі, лясы павыкарчавалі. Вось прырода і мсціць. Мне што? Я свае аджыла. А вось людзям як далей жыць? Вунь, што на свеце робіцца! У нас пекла, а ў Афрыцы снег. Калі такое было, каб у чэрвені чарніцы збіралі?

Дуся сумна ўздыхнула, дастала з торбачкі мяшэчак.

– Светка зараза – ламачча наклала! – абурылася старая, даставая з мяшэчка пячэнне. – А што ей? Ей абы прадаць. Не дагледзеш, накладзе абы-чаго. Вось калі Нінка працавала, дык тая і пакажа, і параіць, што браць, а што не. А гэтая… Думае, калі старая, то і абмануць можна. Старая… Паміраць трэба. Толькі штосьці божачка пра мяне забыўся. Не жадае мяне да сябе прыбраць. Маладыя вунь паміраюць, а я жыву. Пераблыталася ўсе. Дзеці нараджацца не хочуць, старыя паміраць.

Дуся задумліва паглядзела на неба.

– Хаця ў такую спеку паміраць дрэнна. І ўзімку дрэнна. Вось па восені, калі будзе суха, можна. Ды і кветак у восені шмат. Хаця, якія мне там кветкі? Вяночак просценькі і досыць. Трэба Валерцы пра дамавіну напомніць, а тое зрабіць забудзецца. А пакупны не хачу. Маркаўну хавалі ў пакупным. Дык і вузкі, і доўгі. А я хачу, каб па мне быў. Ды яшчэ пару бутэлек гарэлкі прыкупіць трэба, а то на памін не хопіць. Куды-куды, а на памін усе прыцягнуцца…

Дуся смакавала пячэнне.

– Не дагледзела, вось і паклала Светка ламанага. Вось і жыцце ў мяне такое ж ламанае і няўдалае, як гэта пячэнне. Дзяцей выгадавала… Унукі выраслі… Нікому не патрэбна стала… Саме сабой не патрэбна… Цяжка… Ды яшчэ ў такое пекла. Дыхаць нечым… Сэрца шчэміць…

Дуся падхапіла торбачку, паднялася з лаўкі, кінула тужлівы позірк на неба і накіравалася ў хату.

А на небе дзесьці ля гарызонту расплылася танюсенькая шызая палоска. Яна павольна, быццам збіраючыся з сіламі, разлівалася па небасхілу, даруя надзею на доўгачаканы дождж. Але дажду не было.

Яшчэ два тыдні людзі, жывелы, расліны пакутвалі ад спекі.

Яшчэ два тыдні млелі, задыхаліся, прэлі.

А потым зарадзілі дажджы.

Ажно да самой восені.

# Чарнічная ліхаманка

У тое лета казалі – дзе чарнічнік, там і чарніцы. Па вясне мяркавалі, што селета ягад не будзе, ды памыліліся. Чарніц было столькі, што аж цямнела ў вачах.

Знойдзеш лапіну, сагнешся, пачнеш шоргаць буйныя, зпешчаныя ліпеньскім сонейкам ягады, кінеш позірк у бок, а ў дзвюх шагах побач ягады яшчэ буйнейшыя, яшчэ прыгажэйшыя. Кідаешся туды. Шорг, шорг… А вунь на пагорку зусім лісця з-за ягад не бачна. Ты туды. А там у яміне пад ялінай іх яшчэ больш…

Так і скокаеш па лесе, шукаючы, дзе ягады паболей, ды папрыгажэй.

Гадзіны з дзве пабегаеш, потым плюнеш, сядзеш на адным месцы і нетаропка набярэш свой посуд, лаячы сябе за тое, што дарма страціў час, бегаючы па балоце.

Сонца яшчэ не перакуліцца за поўдзень, а ты ўжо цягнешся дадому з поўнымі ведрамі. Хаця, якое там дадому! У тое лета зрэдку хто даносіў лясны скарб да хаты. Па большай частцы накіроўваліся адразу да Вусцінавіча. Той абсталяваў стары сарайчык пад прыемны пункт, дзе і прымаў ягады – чарніцы, брусніцы, журавіны. І сыпаліс ў пластыкавыя скрынкі ягады, перамешаныя з лісцем і сасновымі хваінкамі, абагрэтыя сонейкам і чалавечымі рукамі. І ніхто не шкадаваў сваіх намаганняў. Было чаго! Яшчэ назбіраем. Ды і навошта сабе столькі? Яшчэ з мінулага лета ў падвалах стаяць некранутыя слоікі з варэннем, кампотамі. Чарніцы ж не вішні, не клубніцы. Ахвотчыкаў на іх мала.

Вось і неслі ягады адразу на нарыхтоўчыя пункты. Грошы напачатку там давалі невялікія, але ж лішняя капейка ў гаспадарцы не перашкода. Ды і чымсці трэба было заняць рукі, пакуль на гародах раслі, зелянелі, наліваліся, чакалі свайго часу бульба, морква, буракі.

Вось і цягнулася да лесу з ранку да вечара чарада нарыхтоўшчыкаў. Хто паасобку, хто напару, а хто і ўсей сям’ей.

Ішлі ў лес – глядзелі, колькі сення Вусцінавіч нацарапаў на прылепленай да сцяны сарайчыка паперыне. Кумекалі – здаваць сення, ці пачакаць да заўтрага. Мо, заўтра больш дасць. Але ж, вяртаючы з лесу, вырашалі не чакаць магчымага павышэння кошту. За ноч ягады могуць і сапсавацца. Хто іх потым прыме? Вусцінавіч і гэтак вечна прычэпіцца – то ягады пабітыя, то смецця шмат. Сам бы лерей ў лес схадзіў, чым носам круціць.

Цетка Мар’я, як і ўсе вяскоўцы, бавіла час у лесе. Брала пяцілітровае вядзерка, насыпку і калі толькі завіднеецца, тупала ў лес. Цяжкавата, зразумела, ў ейныя гады, ды хоць рукі і галава пры справе. А тут яшчэ і пляменнікі наведаліся – Кастусь з жонкай Вольгай і двумя дачкамі – Машкай і Ангелінай. Як тут не пабалаваць сваякоў свежымі чарніцамі. Бадай у горадзе іх цяпер і няма. Толькі цетчыных прысмак пляменнікі і ўнучкі есці не сталі. Як пачулі пра тое, што людзі на ягадах грошы зарабляюць, кінуліся ў лес. Ну і цетка з імі.

Тупала следам, намагаючыся не адстаць ад моладзі, бухцела сабе пад нос:

– Ну і назвалі дзеўчыну! Ангеліна. Хіба іншых імен не было? І не выгаварыш. І каму такое ў галаву стукнула?

Кастусь толькі сумна уздыхаў. Агелінай дачку назвала цешча. Гэта ей цюкнула абраць такое неблагагучнае імя. Спрачаліся, крыўдзіліся. Але ж так і пакінулі. Праўда, Ангелінай дачку ні Кастусь, ні Вольга не звалі. Звярталісь усе больш да яе проста – малая.

Мар’я, ідучы ў лес заўседы брала з сабой кавалачак хлеба альбо пару цукерак.

– Лесавічку, – жартавала яна. – Гасцінцы. Хай дапаможа нам ягадак назбіраць.

Малыя толькі пасмейваліся.

– Тут сам не паварушышся, – дзівіўся цетчыным звычкам Кастусь, – ніхто не дапаможа. Ніякі лесавік.

– Так то яно так, – пагаджалася старая. – Але ж хто яго ведае…

І, пакінуўшы на пяньку прысмакі, Мар'я прыймалась за справу. Пляменнікі таксама намагалісь не адстаць ад цеткі. Разбрыдаліс па ўсяму балоту. Шукалі мясціны, дзе ягад паболей. Дзе яны буйнейшыя і спялейшыя. Гукалі адзін аднаго, каб не згубіцца. І зноў кідаліся ў пошукі больш ураджайных лапін.

Вольга ўвесь час трывалася ля Мар'і. Баялася заблытацца ў невядомым месце, ды і цетчыны рассказы ей былі значна цікавейшыя, чым мужыкова мармытанне, ці стогны дачок, калі пойдзем дадому.

– А куды гэта Кастусь з малымі падзеўся? – Мар'я прадбачліва азіралася па баках. – Не заблудзілі б.

– Не заблудзяцца, – супакойвала цетку Вольга. – Не ў першы раз у лесе.

– Не ў першы, – пагаджалася старая. – Але можа так закруціць, што і не зразумееш, як згубішся. Вунь, на мінулым тыдні, Івончык з жонкай у лесе заблудзілі. Ажно ў Сірацінках выйшлі. Кастусь! Ты дзе?

– Тута! – адгукалася рэхам па бару.

– Ідзі да нас! Тут ягад мора!

– Ды і тут поўна! – неслася ў адказ.

Мар'я выцірала твар канцом хусткі, схілялася долу і зноўку пачынала збіраць спелыя чарніцы.

Сонца няспешна каціласяпа небу. Станавілася горача. Посуд ўжо поўны, але Мар'я не спяшалася. Яна любіла, каб назбірана было з гарой. Пляменнікі цярпліва чакалі пакуль цетка выпраміцца, зніме хустку. Значыцца можна ісці дадому. Потым чакалі пакуль дзеўкі дабяруць свой посуд. Мар'я, паставіўшы свае вядзерка на віднае месца, бегала вакол і падсыпала ўнучкам па жменьцы. Кастусь бухцеў:

– Самі хай збіраюць! Не малыя ўжо!

Вось і ў дзевак паціху гарушкі выраслі. Можна і дадому вяртацца.

– Дзякуй богу! Дзякуй лесу! – Мар'я падхапіла вядро з адборнымі, нібы на малюнку, ягадамі і няспешна патупала па пыльнай дарозе ў напрамку весцы. Пляменнікі і малыя накіраваліся за ей следам.

Ішлі моўчкі. Нагаварыліся, пакуль збіралі ягады. Машка з Ангелінай пабеглі наперад. Вольга ішла побач з цеткай, адмахіваючы ад камароў галінкай. Кастусь цягнуўся апошні, паабапал дарогі выглядваючы грыбы.

– Падзівіцесь, – Мар'я спынілася ля вялізнай лужыны пасярод дарогі. – Цуд прыроды. Дажду бадай два тыдні не было, а лужына не высахла.

Абыйсці лужыну можна было толькі з аднаго боку, дзе паміж ей і густым зараснікам маліны сотняй ног была пратоптана вузенькая сцяжынка. Машка з Ангелінай шпарка праскачылі міма лужыны, быццам і не сцяжынка тут была, а шырокая дарога. Вольга таксама без уселякіх перашкод пераадолела перашкоду. А вось Мар'я замроілася, не ўтрымалася на нагах, падслізгнулася і з'ехаўшы са сцяжынкі ў лужыну, залямантавала:

– Ягады! Ягады ратуйце!

Кастусь кінуўся да цеткі, лоўка падхапіў каштоўную ношу. Толькі некалькі ягад рассыпалася па зямлі чорнымі пацеркамі.

– Вось і памылася! – абуралася на сваю нязграбнасць цетка, вылезаючы з лужыны. – І лазню тапіць не трэба.

Машка з Ангелінай ціха пасмейваліся.

– Чаго рагочыце? – Мар'я абтрасла спадніцу. – Дажывеце да маіх гадоў, мо не так летаць будзеце.

Пайшлі далей. Праз поўгадзіны ўжо грукалі да Вусцінавіча.

– Гэй! Есць хто дома? Ягады прымайце!

Вусцінавіч павольна вылез са сваей схованкі.

– Ну чаго дзверы ламаеце? Пачакаць не можыце? Іш ты! Колькі вас тут! Усім кагалам у лес вырашылі? Няйначай увесь лес вынеслі.

– А што? – Мар’я прысела на лавачку ля сарайчыка. – Чаго ў хаце дарма сядзець, калі жывыя грошы ў рукі лезуць.

– Вам паасобку лічыць, – Вусцінавіч адчыніў сваю гаспадарку, – альбо разам?

– Разам, – адказаў Кастусь.

Машка з Ангелінай незадаволена засапелі. Яны ўвесь шлях прыкідвалі куды патрацяць свае грошы. Але з бацькай спрачацца не сталі.

Ссыпалі ягады ў дзве скрыні. Вусцінавіч паставіў скрыні на вагі, пасунуў туды-сюды гіркі, дастаў з кішэні калькулятар, пачаў падлічваць. Памыліўся. Пералічыў. Зноў памыліўся. Зноў пачаў пералічваць.

– Сорак дзве пяцьсот, – не вытрывала малая.

– Правільна, – Вусцінавіч здзіўлена пагледзеў на калькулятар, потым на дзеўчыну, потым зноў на калькулятар.

– Ты глядзі! – войкнула Мар’я. – У цябе, Вусцінавіч, две вышэйшых адукацыі, а ў малой ні воднага, а як хутка падлічыла. Не тое што твая тэхніка!

Вусцінавіч прамаўчаў. Працягнуў грошы і знік са скрынямі недзе ў цемры сарайчыка.

Мар’я і кампанія накіраваліся далей.

Машка з Ангелінай зноўку пасмейваліся. На гэты раз з Вусцінавіча.

– Прыемшчык знайшоўся! – здзіўлялася малая. – Два інстытута скончыў, а з калькулятарам падлічыць не можа.

– І шкарпэткі дзіравыя, – дадавала Машка. – Хіба зашыць некалі?

– Мо і некалі, – уключалась у размову Мар’я. – Увесь дзень ягады прымае.

– Мог бы і новыя купіць, – раіла Ангеліна.

– У яго на новыя грошай няма, – жартаваў Кастусь. – Каб былі, дык ягады не прымаў.

– Вось нарэшце і датупалі, – Мар’я з палегкай уздыхнула. – І ці думала я, што дажыву да такога часу? Тры пакаленні ў лес адразу ходзяць. І калі такое бывала?

– А што гэта вы з пустым посудам вярнуліся? – па-за плотам з’явілася галава суседа Міколы. – Дзе ж вашы ягады?

– У лесе засталіся, – ў тон суседу адказала цетка.

– У лесе! – недаверліва хмыкнуў Мікола. – Ведаем мы гэты лес! Няйначай да Вусцінавіча адразу панеслі. А вось Людка больш за ягады дае.

– Да Людкі яшчэ поўвёскі топаць, – адмахнулася Мар’я. – І грошы ў яе не заўседы бываюць. А тут ля самога лесу. Поўны сервіс.

– Ваша справа, – Міколава галава знікла за плотам.

Скінулі боты, пераапрануліся. Мар’я з Вольгай заняліся абедам. Кастусь, каб забавіць час, сеў у цяньку разблытваць маток лескі, знойдзенай па дарозе. Машка з Ангелінай, пакуль старыя былі пры справе, збеглі на сяло.

Назаўтра зноў усей кампаніяй падаліся ў лес.

Праходзячы міма Вусцінавічай хаты, Кастусь кінуў позірк на сарайчык. Паперкі на ім не было.

– Няўжо прымаць перастаў? – спалохана прамармытала Мар’я.

– Пэўна нулі прыпісвае, – ўсміхнуўся Кастусь.

– Мо і так.

Кінуліся на ўчарашнее месца, але да іх хтосьці тут ужо папоўзаў. І хаця на кусціках там-сям віднеліся буйныя ягады, збіраць іх па адной не было ніякай ахвоты. Кінуліся ў другое месца – і там таксама абзбірана.

– Людзі не спяць, – заклапочана пакачала галавой цетка. – Павыбралі ўсе.

– Нічога, – не траціў надзеі Кастусь. – Наша нам застанецца.

Прайшлі крыху далей. Але і там ягад было не шмат.

– Дурны дзень! – войкала Мар’я. – Посуду набралі, а ягад няма. Вольга, што ты там поўзаеш? Пайшлі адсюль! Няма тут ягад!

– А мне хапае, – Вольга па адной кідала ягады ў вядро.

– І што гэта за інтарэс па адной ягадзіне збіраць? – дзівілася цетка. – Я так не ўмею.

– Гэй! – пачуўся неадкуль з боку кастусевы голас. – Ідзіце да мяне! Тут ягад процьма!

Накіраваліся ў бок Кастуся. Той сядзеў амаль ля самой дарогі і жменямі шоргаў ягады ў вядро.

– Анічога сабе! – Мар’я ўзрушана ўзмахнула рукамі, ўбачышы некранутыя кусцікі чарніц. – Вось дурні! Усе ў лес лезуць, куды падалей, а тут ля прыходу іх відзьмо-нявідзьмо.

Паправіўшы хустку, закінуўшы вядро за спіну, цетка шпарка пачала ссыпаць у назбірку буйныя, як на малюнку ягады. Вольга намагалася не адставаць ад яе. Нават Машка з Ангелінай, не гледзячы на недасып і на адсутнічанне жадання хадзіць у лес, кінуліся наперагонкі збіраць лясныя дары.

– Ніколі не збірала чарніцы жменямі, – пасмейвалася Вольга, перасыпаючы ягады з назбіркі ў вядро.

– Толькі ела, – дадаў Кастусь.

Вольга хацела агрызнуцца ў адказ, ды яе перабіла праходзячаяя міма магазіншчыца Нінка.

– А што гэта вы тут ля дарогі робіце? – здіўлена запытала Нінка. – Хіба вам у лесе месца мала?

– Месца многа, – не адрываючыся ад справы, адказала Мар’я, – ягад мала.

– Ну гэта каму як! – усміхнулася Нінка. – Мне мае застанецца.

– А посуду набрала! – Мар’я выпрамілася, каб крыху размяць здранцвеўшую спіну. – Няйначай начаваць сабралася?

– А колькі набяру, столькі і набяру, – адмахнулася Нінка.

– А Пятро дзе твой? – пацікавілася Мар'я. – Чаго з сабой не ўзяла?

– У Пятра другія інтарэсы, – сумна ўздыхнула Нінка. – Ен больш да пляшкі ахвочы, чым да ягад.

– Ну-ну, – Мар’я перасыпала ягады з назбіркі ў вядро. – Ты там міма Вусцінавіча ішла, паперкі не бачыла?

– Не бачыла. Я ў Людкі здаю, – Нінка звярнула ў лес і знікла паміж сосен.

– Вось будзе, калі Вусцінавіч не прымае, – заенькала Мар’я. – Куды я гэтыя ягады дзену? Калі толькі на наліўку паставіць. Ды і хто яе потым піць будзе?

– Не прападуць, – Кастусь ссыпаў апошнюю жменю ў вядро. – Ўсе! Можна і дадому ісці. Машка, Малая! Дзе вы! Дадому пайшлі!

На бацькін голас з’явіліся дзеўкі. З поўнымі ведрамі, з чорнымі ад ягад тварамі.

– А нічога сабе! – цетка не чакала, што ўнучкі справяцца хутчэй за яе. – Гэта ж трэба — ўсе панабралі ўжо, толькі я адна засталася. Зусім кваліфікацыю страціла.

Дапамаглі цетцы дабраць посуд. Нетаропка накіраваліся ў веску.

На гэты раз Мар’я пералезла праз лужыну без прыгод.

Як і меркавалі, ў Вусцінавіча сення быў не прыемны дзень. Давялося камандыраваць дзевак да Людкі. Самой ісці Мар’е не хацелася. Ногі гудзелі, ды і з Людкай былі нацягнутыя адносіны. Хай маладыя збегаюць. У іх і ногі шпарчэйшыя, і галовы святлейшыя.

– Ну што? – Кастусь выгадваў, колькі яны заробяць сення. – Заўтра пойдзем?

– Заўтра будзе заўтра, – адмахнулася Мар’я. – Ды і перадых трэба зрабіць. Ды і гарод зусім зарос.

– Ну як? Колькі сення заробілі? – Кастусь звярнуўся да вярнуўшыхся дачок і, пачуўшы адказ, заерзаў. – Вы як хочыце, а я заўтра зноў пайду. Такія грошы я нават і за тыдзень на сваей працы не зароблю.

Мар'я, пачуўшы колькі атрымалі сення таксама не ўтрымалася:

– Бог з ім, з гародам, калі шаленыя грошы самі ў рукі цякуць.

Машка з Анегелінай хацелі было паспрачацца, але прыкінуўшы, што і ім перападзе значная частка, прымірыліся.

І ранкам зноў пацягнуліся ў лес.

Па дарозе іх абагнала нейкая кабеціна на веласіпедзе. Прывіталася.

– А ты што, – Мар'я звярнулася да жанчыны, – Васільеўна, ў адпачынку?

– Ды які там адпачынак! – кабеціна саскачыла з веласіпеду і пакрочыла побач з цеткай. – Папрасіла Светку падмяніць на поўдня. У ягады збегаць. Івончык, кажуць, учора на паўмільена здаў.

– У Івончыка транспарт і зяць ляснічы – месцы ведае, – заўважыла Мар'я. – Чаму ж не здаць на столькі. Ты б у яго распытала, куды ен ездіць?

– Скажа ен! Чакай! – жанчына скокнула на веласіпед і падалася наперад.

– А нам і ў сваім балоце ягад хопіць, – Кастусь вырашыў падбадрыць цетку. – Ну? Куды сення накіруемся? На старое месца, ці на новае?

– А дзе ягады, туды і мы, – адказала цетка, крыху пазайздросціў таму, хто ў лес не на сваіх дваіх ходзіць.

Ну і бог з імі! Нам і так добра. Прагуляемся. Паветрам свежым падыхаем. На прыроду палюбуемся. Спіну пагнем. Рукі выпецкаем. І дадому вернемся. Стомленыя і задаволеныя, што не трэба нікуды ехаць, паліць бензін, трэсціся ў машыне. Тут і ў сваім балоце ягад хапае. Ходзіш па старых месцах, а такое ўражанне, што ў першы раз. Быццам тыя чарніцы за ноч адрастаюць. Яшчэ бунейшыя, яшчэ прыгажэйшыя.

У гэты раз здавалі Вусцінавічу. Той, пачуўшы, што людзі да Людкі пабеглі, падняў кошт ледзь не ў два разы.

Кастусь спахмурнеў:

– А каб я ведаў, то ўчора б не здавалі! Сення б удвая больш атрымалі!

– Усіх грошай не заробіш, – супакойвала яго цетка. – Ітак, дзякуй богу, за тры дні амаль на маю пенсію здалі. Ну што? Заўтра ідзем, ці перадых зробім?

– Які тут перадых! – запярэчыў Кастусь. – Узімку адпачнем!

– Ну як пажадаеце, – цетка кінулася ў гарод, ратаваць бульбу ад жукоў. – Можна і збегаць, калі дажду не будзе.

– Не будзе, – паспяшыў запэўніць старую Кастусь. – Я прагноз па радые чуў – яшчэ тыдзень без дажду абыйдзецца.

Але прагноз не спраўдзіўся. Назаўтра зранку паліў дождж. Нядоўгі, рэдкі. Пабрызгаў з поўгадзіны і сціх. Паліць не паліў, а напаганіў. Перабіў усю ахвоту ісці ў лес. Ну яно і добра. Трэба ж і перадыхнуць крышачку. А то акрамя лесу аніякімі іншымі справамі займацца не было часу. Кастусь нарэшце падрамантаваў заваліўшыйся плот. Вольга ператрэсла ўсе дываны, перамыла ў хаце, павыкідвала на сметнік старыя газеты, дзіравыя каструлі і яшчэ безліч розных, як здавалася Мар'і, карысных рэчаў. Машка з Ангелінай пад пільным даглядам бабулі выпалолі ўвесь гарод і зноўку падаліся на сяло.

Дзень скончыўся. Заход абяцаў назаўтра добрае надвор'е. Пагадзіліся збегаць ранкам у лес. Не так у заробкі, як у ахвотку. Але ранкам зноў сыпануў дождж. Лес адклаўся.

І так амаль два тыдні. З ранку дожджык, а потым сонца. Яно, канечне, можна было б і схадзіць, але збіраць мокрыя ягады асаблівага жадання не было. Ды і мінулы азарт прапаў. Ды і гародніна ўжо прасілася з градак у слоікі. А тут ўжо не да чарніц.

Так і абсыпаліся апошнія ягады, не дачакаўшыся пакуль на іх хто-небудзь зверне ўвагу.

# Зяць у перспектыве

З самога ранку Сяргей тупаў па хаце без настрою. Адпачынак толькі пачаўся, а яго ўжо цягнула на працу. І ўсе з-за жонкі, з-за гэтай, хай таму павылазіць, хто сказаў лепшай паловы жыцця! І чаму гэта нашы жонкі чакаюць выхадных альбо адпачынку, каб загрузіць нас працай, і тым самым сапсаваць настрой на ўвесь астатні час? Хіба на гэта не існуе будніх дзен? Дык не! Толькі збярэшся на рыбалку, вырашыш паваляцца ў ложку да абеду, ці проста навесці парадак у сваіх жалезках і думках, як жонка навыдумляе розных спраў, якія ані ў якім разе нельга адкласці на потым, якія неабходна зрабіць менавіта зараз, у гэтую хвіліну. Ну і дзе тут не будеш злавацца? А яна, як назло, будзе ўвесь час верашчаць над вухам, выдумляючы ўсе новыя справы і даючы процьму карысных парад, якія на самой справы аніякай карысці і не маюць.

# Конец ознакомительного фрагмента.

Текст предоставлен ООО «Литрес».

Прочитайте эту книгу целиком, купив полную легальную версию на Литрес.

Безопасно оплатить книгу можно банковской картой Visa, MasterCard, Maestro, со счета мобильного телефона, с платежного терминала, в салоне МТС или Связной, через PayPal, WebMoney, Яндекс.Деньги, QIWI Кошелек, бонусными картами или другим удобным Вам способом.